


Чашніцкі раён Віцебскай вобл. размешчаны на Пд ад Віцебска. Утвораны 17.8.1924 г. Мяжуе з Бешанковіцкім, Лепельскім, Сенненскім, Талачынскім раёнамі Віцебскай, Крупскім і Барысаўскім раёнамі Мінскай абласцей. Плошча 1,5 тыс. км², насельніцтва 44 тыс. 700 чалавек (1995). Цэнтр раёна — г. Чашнікі, 10 тыс. 800 чалавек (1995). У складзе раёна г. Новалукомль, рабочы пасёлак Акцябрскі, 229 сельскіх населеных пунктаў. У раёне акрамя гарадоў Чашнікі і Новалукомль Акцябрскі пасялковы Савет, 11 сельскіх Саветаў — Альшанскі, Антапольеўскі, Іванскі, Красналуцкі, Кругліцкі, Латыгаліцкі, Лукомскі, Новазаранскі, Пачаевіцкі, Празямлянскі і Чарэйскі. Паверхня раёна плоскахвалістая пераважна ў межах Чашніцкай раўніны. Праз раён праходзіць Лукомскае ўзвышша (на ПдЗ і З). На ПнУ ўзгоркі Катарсы, якія ўтварыліся пасля Паазерскага ледавіка. Найвышэйшы пункт — г. Спаская — 256 м (2 км на Пн ад в. Дабрамыслі Новазаранскага сельсавета). Праз раён праходзіць Чашніцкі даплатформавы разлом. Маюцца карысныя выкапні: 3 радовішчы гліны з агульным запасам 107,3 млн. т, 3 радовішчы торфу — 10,7 млн. т, радовішчы пясчана-гравійнага матэрыялу. Праз раён цякуць рэкі Ула, Усвейка, Лукомка, Эса, Байна, Югна (усе басейна Заходняй Дзвіны). Азёры — Лукомскае, Жэрынскае, Чарэйскае, Старасельскае, Слідзец, Баярскае, Хотлінскае, Ямнае, Сцержань. Сярэдняя тэмпература студзеня —7,4 °С, ліпеня + 17,9 °С. Ападкаў 620 мм за год. Вегетацыйны перыяд 186 сутак. Пад лесам 24 % тэрыторыі. Батанічныя заказнікі: дрэвастою дуба «Зялёнае ляда», дрэвастою дробналісцёвай ліпы «Ліпнікі», біёлага-батанічны заказнік балота «Саснягі», тарфяны заказнік лекавых гразяў «Хвашчавое». Пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі занята 48,6 % тэрыторыі раёна. Асноўныя землекарыстальнікі: 9 калгасаў, 10 саўгасаў, 47 фермерскіх гаспадарак. Працуе 12 прамысловых прадпрыемстваў; старэйшае — папяровая фабрыка «Чырвоная зорка». Самая вялікая ў беларускай энергетычнай сістэме Лукомская ДРЭС. Праз тэрыторыю раёна праходзіць чыгунка Орша — Лепель, аўтамабільныя дарогі на Віцебск, Мінск, дарогі да цэнтраў калгасаў і саўгасаў. Зялёныя зоны ля Чашнікаў складаюць 1029 га (лясы ля вёсак Проземля — 324 га, Варкі — 187, Должыца — 229, Копцевічы — лясны масіў Шатурына — 288 га). У 80-я гады на заходнім беразе воз. Лукомскае створана зона адпачынку, дзе размешчаны прафілакторый на 50 месц і дзіцячы лагер на 240 месц. Зона адпачынку ў Чашніках — правы бераг р. Ула, дзе размешчаны парк Бессмяроцця і месца былой Бярэзінскай воднай сістэмы. З 1930 г. выходзіць раённая газета «Чырвоны прамень».